# СЕСІЯ БЯРЭ РАЗБЕГ

Яшчэ напярэдадні святкавання слаўнага 900-годдзя Мінска ў некаторых студэнцкіх групах нашага універсітэта пасля залікаў пачаліся экзамены. Цяпер жа вясновая сесія ў поўным разгары. Выпускнікі здаюць апошнія экзамены—дзяржаўныя; трымалі справаздачу па гісторыі філасофіі студэнты чацвёртага курса філалагічнага факультэта, матэматыкі і фізікі праверылі свае веды на экзаменах па навуковаму атэізму. Спяшаюцца выдатна завяршыць навучальны год тыя, каму прадстаіць паехаць на цаліну, на будоўлі Беларусі, Чэхаславакіі, Польшчы...

Наогул, сесія пачала свой падлік на ўсіх факультэтах. Многія студэнты з вялікай асабістай адказнасцю падыйшлі да падрыхтоўкі сваёй справаздачы ў юбілейным годзе. Аднак ужо ў рэдакцыю паступаюць сігналы аб тым, што на асобных экзаменах студэнты пачынаюць атрымліваць нездавальняючыя адзнакі. Партыйным і камсамольскім арганізацыям факультэтаў патрэбна неадкладна разабрацца ў прычынах правалаў, прыняць неабходныя захады, каб своечасова падтрымаць тых, хто спатыкнуўся ўжо з першых крокаў, пачынае падводзіць сваю групу, курс, факультэт, каб папярэдзіць недахопы.

Жадаем усім студэнтам выдатных і добрых адзнак у сесіі юбілейнага года.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі
УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (672) ● ПЯТНІЦА, 2 чэрвеня 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX



# ПЕРАД ДРУГОЙ СТУПЕНЬКАЙ

Яшчэ ў верасні, калі ўпершыню студэнты-першакурснікі матэматычнага факультэта адчынілі дзверы аўдыторый, сэрцы іх былі напоўнены бязмежнай радасцю, вялікім хваляваннем. Перад імі раскрываўся новы свет—свет навукі,— цярністая дарога ў жыццё.

Ішлі дні, тыдні... Першакурснікі асвойваліся. Ужо яны смела, без ваганняў падымаюць рукі, каб адказаць на семінарскіх занятках. У журналах з'яўляюцца першыя чацвёркі, пяцёркі. Як радуюць бацькоў або знаёмых прыемныя пісьмы, у якіх студэнты з захапленнем пішуць аб сваіх першых поспехах у вучобе!

Але не толькі заняткі. Спорт, грамадская праца. Да ўсяго ёсць справа першакурснікам.

А цяпер сесія. Яна ўсяго другая ў студэнтаў адзінаццатай групы. Залікі, залікі... Канешна, бывае, хто-небудзь і не вытрымае напружанага рытма сесіі. Тут ужо справы горшыя. Яшчэ адну ці дзве гадзіны сну трэба урваць ад сябе, каб дагнаць групу. Акрамя пераздачы, патрэбна рыхтавацца да наступнага па графіку. Добра, што заўсёды адчуваецца падтрымка сяброў з групы. Калі б не так, тады... Студэнцкая дружба. Нават нельга знайсці такіх слоў, каб даць ёй поўнае вызначэнне, тую ролю, якую яна адыгрывае ў лёсе студэнта.

Выкладчык вышэйшай алгебры і тэорыі лічбаў дацэнт Павел Трафімавіч Козел нядаўна прымаў залік у студэнтаў гэтай групы. Студэнты, у асноўным, былі дора падрыхтаваны да здачы. Гэта ў першую чаргу датычыцца студэнтаў групы Г. Косцік, В. Беляеўскага, О. Дуб, В. Марчанкі. Але, на жаль, было не мала здавальняючых адказаў. Гэта сведчыць пра тое, што не ўсе студэнты старанна працавалі на працягу навучальнага года. У нас ўжо стала правілам: хто рыхтуецца паўсядзённа ўвесь год, той у час сесіі паказвае толькі добрыя ці выдатныя веды. Таму многім студэнтам гэтай групы трэба больш працаваць, бо добрыя веды — гэта вялікі крок у падрыхтоўцы сябе да працы, да таго, каб стаць высокаадукаваным, высокакваліфікаваным спецыялістам.

Б. ДЗМІТРЫЕЎ.

На здымку: студэнт першага курса матэматычнага факультэта Юра Козел здае залік па алгебры.

# ДРУЖНА І ЎПЭЎНЕНА

Каб нікому не перашкаджаць, хлопцы гутараць аб чымсьці ціхенька. Потым зноў займаюцца сваімі справамі; акунаюцца з галавою ў кніжкі. Толькі потым усё стала зразумелым. Студэнты сёмай групы другога курса з фізічнага факультэта рыхтуюцца да апошняга заліку па англійскай мове. Калі ўзнікаюць складаныя сказы, а ў іх нешта не зразумела, тады сябры - аднакурснікі звяртаюцца адзін да другога за дапамогай. Вельмі добра прыдумалі — рыхтавацца не ў адзіночку, а па некалькі чалавек. Нездарма кажуць: «У грамадзе і каша смачная».

Я звярнуўся да хлопцаў: «Як справы?» Толькі ўсмешкі. Відаць, усё добра. І дзейсна, да апошняга ўсе залікі сданы з поспехам.

— А хто ж лепш усіх здаў?

Маўчаць... Але потым усё ж адказалі, толькі не імёны, маўляў, што мы, пра нас не варта... Што ж, сціпласць — добрая рыса ў характары чалавека.

Пра іх, гэта значыць, пра Васю Шепялевіча, Мішу Загалаўца, Аркадзя Хейфеца і Зінаіду Герчыкаву — самыя добрыя водгукі. Імі ганарыцца група. Наконт экзаменаў, якія неўзабаве пачнуцца, можна сказаць тое ж самае: «Здадуць, і, відаць, добра».

М. БАДАЕЎ.

# ПАД НЕАСЛАБНЫ КАНТРОЛЬ

*Курсавую работу прынята лічыць вынікам творчай працы студэнта за цэлы год. Гэта сапраўды так, бо нельга не згадзіцца, калі ўлічваць, што студэнт над курсавой працуе на працягу ўсяго навучальнага года: тэмы ж выбіраюцца яшчэ ў верасні месяцы, калі заняткі толькі пачынаюцца. Але як атрымліваецца на самай справе? У многіх выпадках студэнт пачынае прыкладаць максімальную энергію толькі тады, калі яго пачнуць «прыціскаць» у самым канцы навучальнага года, за месяц, за тыдзень, а то і за лічаныя дні да тэрміну здачы работ. Адсюль: што пасееш — тое і пажнеш.*

*Так атрымалася і ў студэнтаў III курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта, якія пісалі курсавыя работы па беларускай мове. Трэба сказаць, што большасць папрацавала нядрэнна, хоць выбраныя тэмы былі не з лёгкіх. Паспяхова справіліся з работамі Т. Толсцікава, С. Законнікаў, Л. Холад, Г. Пішчык, Т. Буслава і многія-многія іншыя. Якасць работ курса ў цэлым была б яшчэ больш высокай, калі б некаторыя студэнты не адносіліся да сваіх работ паспешліва, на скорую руку. Шматлікія перакрэсліванні, неакуратнасць гавораць, што гэтыя студэнты працавалі над курсавой літаральна некалькі дзён. У выніку — пасрэдныя адзнакі.*

*Вывады падказваюць, што навуковыя кіраўнікі студэнцкіх работ павінны трымаць сваіх выхаванцаў пад неаслабным кантролем на працягу ўсяго навучальнага года.*

*С. ЧАРЭШНІКАЎ.*

# СПРАВАЗДАЧА ЗА СЕМЕСТР

Зараз — гарачыя дні ў журналістаў-трэцякурснікаў. Сесія. Шостая па ліку. І кожны раз ім здаецца: «Ну, гэта самая цяжкая». І, сапраўды, так. Чым вышэй курс, тым больш прыходзіцца мець справу са складанымі, але патрэбнымі і цікавымі прадметамі.

Гісторыя бальшавіцкага друку. Цяжкі шлях першых рабочых, сацыял-дэмакратычных, бальшавіцкіх газет. Удзел у іх выпуску і пастаяннае супрацоўніцтва віднейшых палітычных дзеячоў У. І. Леніна, С. Шаумяна, І. Бабушкіна, таленавітых публіцыстаў Вароўскага, П. Лепяшынскага, А. Луначарскага і шмат іншых.

Пра ўсё гэта даведаліся студэнты трэцяга курса з лекцый па гісторыі бальшавіцкага друку, якія праводзіў кандыдат гістарычных навук дацэнт Марк Саламонавіч Зярніцкі. Пазнанне гэтага прадмета намнога пашырыла светапогляд будучых журналістаў. І не дзіўна, што многія з іх выбралі тэмы для курсавых работ іменна па бальшавіцкаму друку дакастрычніцкага перыяду. Нават, судзячы з гутарак, некаторыя ўжо цвёрда вырашылі пісаць дыпломныя па тэмах з гэтага прадмета.

Ужо здан экзамен па гісторыі бальшавіцкага друку. Ззаду—залікі па навуковаму камунізму, тэорыі і практыцы партыйнага савецкага друку.

Як бачыце, студэнты аддзялення журналістыкі не адрозніваюць грамадскіх дысцыплін ад прафіліруючых. Нельга разумець працу журналіста без сувязі з грамадскім жыццём. Таму выкладчыкі Паўлючэнка (навуковы камунізм), Цакуноў (палітэканомія сацыялізма) прыклалі ўсе намаганні, каб лепш і больш данесці ведаў да студэнтаў. І, нарэшце, вельмі прыемна і выкладчыкам, і студэнтам, што выкладанне прадметаў, напружаная праца, канспекты, вучэбныя дапаможнікі — усё пайшло на карысць і дало добрыя вынікі. Вось, напрыклад, па палітычнай эканоміі асноўнымі адзнакамі былі «выдатна» і «добра». Менш за ўсё —троек.

Хто ж лепшы ў групе? А іх шмат: Анатоль Гарбачоў, Хведар Кулакоў, Уладзімір Гулевіч, Алег Слука, Віктар Захарчук —гэта тыя, хто служыць для ўсіх прыкладам і ў вучобе, і ў паводзінах, а таксама ў грамадскім жыцці.

Рана гаварыць аб канчатковых выніках сесіі, бо яна яшчэ ідзе. Але ўжо можна зрабіць некаторыя прагнозы. Што датычыцца вышэйпералічаных таварышоў, за іх можна быць спакойнымі. Нездарма кажуць: «Добры старт—гэта спадарожнік добрага фінішу».

Нам зразумела: у хлопцаў двайная радасць. Па-першае, добрая вучоба, добрыя веды —гэта ўпэўненыя крокі па здзяйсненню сваёй мары. Па-другое... Тут ужо яны самі скажуць за нас: «Няхай нашыя поспехі паслужаць скромным укладам у агульныя поспехі дзевяцісотгадовага, роднага, любімага Мінска, горада-ардэнаносца!»

А. ЦЕРАХОВІЧ.

# ПЕРАДАЧА ТРАДЫЦЫІ

**Калі ў першакурснікаў пачаўся тур другой сесіі, то ў выпускнікоў «бітва» за веды ў асноўным закончана. У залікоўках адзначаны сляды экзаменаў, дысцыплін, якія вывучаліся ва універсітэце. У адных яны цвёрдыя, з прыгожа выкрэсленымі контурамі пяцёрак і чацвёрак, у другіх адзначаны «дзяржаўнай» тройкай, якіх у юрыстаў, як правіла, вельмі мала. Цяпер юнакоў і дзяўчат чакае вытворчасць, заліковай кніжкай тут для іх будзе жыццё, а вытворчасць пакіне на ёй адбітак слядоў сваіх адзнак. Якія яны будуць: выдатныя, добрыя, пасрэдныя — залежыць ад выпускніка, як ён старанна і дабрасумленна адносіўся да выканання вучэбнага плана. Настрой жа ў выпускнікоў бадзёры. Ім хочацца хутчэй уліцца ў слаўную працоўную сям'ю, але радасць не-не дый уступіць месца нейкаму смутку, таму што ў спісах універсітэта ты значышся апошнія дні, што артыманы дыплом у юбілейным годзе Савецкай улады абавязвае многаму. Менавіта, пра гэта і гаварылі ў сваіх выступленнях студэнты юрыдычнага факультэта Люба Дарогіна, Коля Геракса, і іншыя на традыцыйнай цырымоніі перадачы эстафеты слаўных спраў выпускнікамі першакурснікам. Была зачытана клятва студэнтаў першага курса, у якой яны абяцалі сваім старэйшым таварышам старанна вучыцца, заўсёды памнажаць слаўныя традыцыі камсамоліі юрыдычнага факультэта.**

**У канцы ўрачыстасці выпускнікам ад першакурснікаў былі ўручаны кветкі.**

П. ГЛЕБКА,

**НА ЗДЫМКУ: камсорг першага курса Зоя Жгун уручае кветкі выпускнікам.**

**Фота студэнта трэцяга курса юрфака**



# Ардэнаносны Універсітэт — 50 годдзю Савецкай улады!

## НА АГЕНЬЧЫК У ІНТЭРНАТ

...Над горадам апускаецца ціхі вясенні вечар, на вуліцы ўспыхваюць яркія электрычныя агні. Што ні кажы, але цяжка ўседзець у пакоі ў такі вечар, калі паветра напоўнена водарам ранняй вясны, калі прыемна адчуваць свежасць і цеплыню. І тым не менш у чырвоным кутку інтэрната па вуліцы Свярдлова людна. Студэнты сабраліся на чарговы вечар пытанняў і адказаў на прыродазнаўчыя, навуковыя і філасофскія тэмы.

У гасцях у студэнтаў інтэрната на гэты раз былі выкладчыкі кафедры марксісцка - ленінскай філасофіі: дацэнты Э. В. Клёсава, Р. А. Левін, А. І. Ляўко. Яны прышлі сюды, каб адказаць на шматлікія пытанні, якія так зацікавілі студэнтаў. Дастаткова пазнаёміцца з пытаннямі, каб упэўніцца, наколькі шырокае кола студэнцкіх інтарэсаў. Вось некаторыя з закранутых пытанняў: аб шляхах далейшага развіцця марксісцка-ленінскай філасофіі і аб існаванні антырэчыва, аб развіцці кібернетыкі і генетыкі, аб сучасных прыродазнаўчых тэорыях, аб паходжанні жыцця на Зямлі і многія іншыя.

Выкладчыкі адказваюць на пытанні, а з залы паступаюць запіскі з новымі цікавымі тэмамі, якія таксама прыцягваюць увагу студэнтаў. Размова канчаецца, але прысутныя не разыходзяцца, узнікаюць спрэчкі, якія пасля пераносяцца ў пакоі. Вечар працягваўся, але ўжо ў другой форме, прыцягваючы ўвагу да закранутых пытанняў і іншых студэнтаў.

«Пасля вечара мы некалькі дзён вялі спрэчку па многіх пытаннях», — сказаў студэнт III курса хімічнага факультэта П. Паляшчук. Значыць, вечар пытанняў і адказаў быў удалым і пайшоў на карысць.

На самай справе, вечарам засталіся задаволены як студэнты так і выкладчыкі. Студэнты атрымалі новы матэрыял па тых ці іншых праблемах, у іх з'явілася жаданне самым дакапацца да праўды, пазнаёміцца з новай літаратурай, з'явілася цікавасць да новых праблем.

Правядзенне вечароў пытанняў і адказаў у інтэрнаце стала традыцыяй, прытым вельмі добрай. І ў гэтым немалая заслуга партбюро хімічнага факультэта (сакратар П. П. Сіліванчык), кафедр марксісцка-ленінскай філасофіі (заг. кафедры прафесар В. І. Сцяпанаў), навуковага камунізма (заг. кафедры М. Г. Круцько), студсавета інтэрната, студэнтаў-энтузіястаў хімічнага факультэта.

У мінулым навучальным годзе работнікі кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі правялі першы вечар пытанняў і адказаў у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова, а ў гэтым годзе таксама працягваецца добры пачын студэнтаў універсітэта.

У першым семестры гэтага навучальнага года вечар пытанняў і адказаў быў прысвечаны пытанням міжнароднага камунізма, па якіх выступалі дацэнт А. Д. Гусеў, кандыдат гістарычных навук Г. Я. Галенчанка, аспірант В. М. Саульчэнка і заг. кафедры дацэнт М. Г. Круцько. Пытанні, асвечаныя работнікамі кафедры, выклікалі цікавасць у студэнтаў. Вечар таксама прайшоў арганізавана, змястоўна. Студэнты засталіся задаволенымі такімі размовамі і выказалі пажаданне часцей сустракацца «за круглым сталом» у інтэрнаце з выкладчыкамі розных кафедр.

Вечары пытанняў і адказаў паказваюць, што яны з'яўляюцца эфектыўнай формай выхавання студэнтаў, расшырэння іх кругагляду,- стымулявання зацікаўленасці да розных галін ведаў. Правядзенне такіх вечароў дазваляе быць у курсе студэнцкага жыцця, наглядаць за інтэлектуальным ростам, ведаць кірунак і шырыню іх інтарэсаў. Хацелася, каб да гэтай важнай і патрэбнай справы было прыцягнута як мага больш кафедр універсітэта.

Ю. ГУСЕЎ,
кандыдат філасофскіх навук, наш карэспандэнт.

## ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

НАШ універсітэт у поўным сэнсе гэтага слова — дзецішча Кастрычніка. БДУ быў першай вышэйшай навучальнай установай на Беларусі, першы навуковы цэнтр. Фізмат быў адкрыт праз год пасля стварэння універсітэта, у 1922 годзе. Гэта было невялікае аддзяленне педагагічнага факультэта. На фізмаце працавалі ўсяго два прафесары: прафесар астраноміі і механікі Міхайлоўскі і прафесар фізікі, супрацоўнік С. І. Вавілава — Я. Я. Сіроцін. Матэматыку і фізіку выкладалі настаўнікі сярэдніх школ горада. Я вучылася ў 20-ыя гады ва універсітэце. Мае настаўнікі па матэматыцы і фізіцы перайшлі на работу ва універсітэт і чыталі нам лекцыі. Цяжка цяпер і ўявіць тыя ўмовы для занятнаў. Нават тэмы дыпломных работ мы выбіралі самі. Кніг па рускай мове было вельмі мала, спытаць не было ў каго.

Помню, я знайшла кнігу Камке, на нямецкай мове, «Інтэграл Лібега». Там, у пачатку кнігі, быў прапушчан цэлы друкаваны ліст, прысвечаны тэорыі меры мноства. Безумоўна, што было далей, я не разумела, а растлумачыць ніхто не мог.

У 1922 годзе прыехалі да нас ва універсітэт два буйных вучоных: геаметр Ц. Л. Бурсцін з Аўстрыі і асістэнт Эйнштэйна Граммер. Прафесар Бурсцін быў камуністам і вельмі многа зрабіў для развіцця фізіка-матэматычных навук у Беларусі. Па яго ініцыятыве ў аспірантуру Масквы і Ленінграда было напраўлена многа выпускнікоў універсітэта. Сярод іх: А. Е. Турэцкі, Ф. І. Фёдараў , А. Н. Сеўчанка і іншыя. Ён прыцягнуў для работы ва універсітэце М. В. Ламбіна, М. А. Лукомскую і загінуўшага пасля на фронце таленавітага алгебраіста У. Л. Нісневіча. Па ініцыятыве Бурсціна ўпершыню быў створан фізіка-матэматычны інстытут Акадэміі навук БССР. Жыццё прафесара Бурсціна трагічна абарвалася ў 1937 годзе.

У пасляваенныя гады на нашым факультэце чыталі курсы лекцый многія вучоныя Масквы і Ленінграда. Яны жылі адзін-два месяцы ў Мінску і чыталі лекцыі па неабходных і спецыяльных курсах. Сярод іх былі: І. М. Гельфанд, А. М. Ложынжынц і іншыя. Яны многа зрабілі для падрыхтоўкі кадраў.

Універсітэт узнавіў сваю работу ў 1943 годзе на станцыі Сходня, пад Масквой. Лекцыі ў асноўным чыталі прафесары Маскоўскага універсітэта.

Цяпер у нас ёсць свае матэматычныя школы, буйныя вучоныя.

Вельмі многа зрабіў для развіцця матэматычных навук на Беларусі акадэмік Дзмітрый Аляксеевіч Супруненка. Ён вярнуўся да навуковай працы, ва універсітэт, у 1945 годзе ў салдацкай шынелі, пасля перамогі над гітлераўскай Германіяй, з баямі прайшоўшы па дарогах вайны з 1941 года.

Дзмітрый Аляксеевіч стварыў у Беларусі алгебраічную школу.

У 50-ых гадах пачалі працаваць у Беларусі акадэмікі Н. П. Яругін, В. І. Крылоў.

Да слаўнага юбілея Савецкай улады на Беларусі склаўся вялікі калектыў матэматыкаў.

З невялікага фізіка-матэматычнага аддзялення універсітэта выраслі два буйнейшыя факультэты: матэматычны і фізічны.

Акрамя вышэй упамянутай алгебраічнай школы, створанай Д. А. Супруненкам, маецца школа па звычайных дыферэнцыяльных ураўненнях пад кіраўніцтвам акадэміка Яругіна і доктара навук Багданава.

Паспяхова праводзіцца работа па краявых задачах пад кіраўніцтвам акадэміка Гахава. Сур'ёзныя вынікі ёсць і ў галіне ўраўненняў матэматычнай фізікі (В. Т. Ждановіч, А. М. Родаў, Н. І. Брыж), геаметрыі (Л. К. Тутаеў, А. С. Федэнка і іншыя).

Няма сумнення ў тым, што нашы маладыя таленавітыя дактары навук В. Г. Спрынджук у галіне тэорыі лікаў і В. П. Платонаў у сучаснай алгебры створаць яшчэ свае школы.

А. Н. НАХІМОЎСКАЯ.



*Бібліятэка нашага ўніверсітэта ў гэтыя дні стала асабліва мнагалюднай. Тут студэнты яшчэ і яшчэ раз перагортваюць канспекты, старонкі вучэбнікаў. Хто ведае, магчыма ў вось гэтых дзяўчат, якіх сфатаграфаваў наш фотакарэспандэнт А. Кадзет, заўтра першы ў летняй сесіі экзамен?*

## ГЭТАГА ПАТРАБУЕ НАВУКА

ЯШЧЭ не адзвінелі званкі лекцый гэтага навучальнага года, а ўжо калектыў вучоных і супрацоўнікаў філалагічнага факультэта сумесна з дэканатам пачаў падрыхтоўку да будучага. На факультэце распрацоўваецца новы вучэбна-метадычны план па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў з мэтай развіць у цяперашніх студэнтаў, а ў будучым выкладчыкаў сярэдніх школ і аспірантаў навукова-творчую думку і разам з тым выявіць найбольш таленавітых да навуковай і даследчай працы. Мяркуецца, што кожны студэнт на працягу пяцігадовага навучання ва універсітэце будзе мець свайго навуковага кіраўніка з ліку дацэнтаў, прафесараў і старшых выкладчыкаў, пад наглядам якога ён будзе працаваць над выбранай тэмай курсавой, дыпломнай ці проста навуковай работы. За кіраўніком, павінна быць замацавана не больш, як 16 студэнтаў, каб апошнім надзяляць як мага больш увагі.

Толькі пры кафедры беларускай літаратуры будзе дзейнічаць каля пяці спецсемінараў, кожны з якіх будзе весці работу ў адным пэўным кірунку, напрыклад, будуць праводзіцца семінары для тых, хто захоча сканцэнтраваць сваю ўвагу на праблемах беларускай прозы (нав. кір. дацэнт Дз. Бугаёў), сучаснага беларускага рамана (нав. кір. дацэнт І. Я. Навуменка), на праблемах традыцый і наватарства ў беларускай сучаснай літаратуры (нав. кір. прафесар М. Р. Ларчанка) і па многіх іншых.

Такія спецсемінары будуць працаваць і пры кафедрах рускай мовы, рускай літаратуры, агульнага мовазнаўства, зарубежнай літаратуры. З кожным годам сетка спецсемінараў будзе павялічвацца.

Тое, што задумана на філалагічным факультэце, не проста выдумка. Гэтаму вучыць вопыт лепшых ВНУ нашай краіны. Такія запатрабаванні выстаўляе само жыццё, навука, якая не стаіць на месцы, а рухаецца з кожным днём ўсё далей і далей.

А. МАРОХІН.

## УРАЧЫСТА, З УЗДЫМАМ

УРАЧЫСТА і прыўзнята адсвяткавалі прафесары, выкладчыкі, студэнты, увесь шматтысячны калектыў нашага універсітэта юбілей сталіцы рэспублікі. Парткомам, камітэтам камсамолам і іншымі грамадскімі арганізацыямі было створана многа самых розных фотастэндаў аб гераічным мінулым нашага горада, аб барацьбе мінчан за незалежнасць, за волю, за еднасць са сваім старэйшым братам — рускім народам. Асабліва добры прыклад у гэтых адносінах праявілі выкладчыкі і студэнты гістарычнага факультэта.

Таварыства «Веды» арганізавала некалькі рэйдаў у падшэфныя калгасы, саўгасы, заводы, фабрыкі. П... рад калектывамі прадпрыемстваў выступілі лектары універсітэта. Яны расказалі шмат цікавага аб барацьбе Камуністычнай партыі за ўстанаўленне Савецкай улады на Беларусі.

Вялікая група прафесарска-выкладчыцкага калектыва, а таксама студэнтаў была запрошана на ўрачыстасці свята ў розныя культурныя ўстановы сталіцы. А некаторыя студэнты, у прыватнасці, падрыхтоўчага факультэта, прынялі нават удзел у спартыўных спаборніцтвах на стадыёне «Дынама», што былі прысвечаны юбіляру-Мінску.

Сканцэнтраваныя, задумёныя погляды ў гэтых юнакоў. Так заўсёды бывае і ўжо ў даволі сталага фізіка і ў таго, хто вырашыў ім стаць. Апошнім прыходзіцца многа працаваць на лекцыях, у лабараторыях, і рабіць самае звычайнае ў жыцці студэнта — здаваць залікі і экзамены. Паспяховая здача іх выклікае хваляванне і радасць, што курс, узяты на авалодванне ведаў правільны, што пасля пяцігадовай вучобы станеш высокакваліфікаваным спецыялістам.

НА ЗДЫМКУ: група студэнтаў другога курса фізічнага факультэта перад залікам па замежнай мове.

Фота А. Кадзета.



# НА ШЛЯХУ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ

*На кафедрах*

У МІНУЛЫМ навучальным годзе на фізічным факультэце была арганізавана кафедра цеплафізікі і распачата падрыхтоўка студэнтаў па гэтай спецыялізацыі. Аналагічная кафедра і спецыялізацыя існуюць цяпер толькі ў Маскоўскім універсітэце.

Назва кафедры некалькі ўмоўная і не адлюстроўвае поўнасцю яе навуковага напрамку. У дзейнасці ж маецца на ўвазе не толькі вывучэнне працэсаў пераноса цяпла, цеплаабмена, але і ўсяго кола з'яў пераноса, ці нават больш шырока — даследвання розных неабрацімых, незваротных нераўнаваговых працэсаў.

Спрабаваць пералічыць апошнія, бадай, бескарысна. Куды прасцей напомніць, што ўсе мікраскапічныя працэсы ў прыродзе з'яўляюцца незваротнымі. Гэта вынікае ўжо з самога характару мікраскапічных фізічных сістэм, якія складаюцца з вялізнай колькасці малых элементарных падсістэм (часцінак, атамаў, малекул, розных элементарных узбуджэнняў — фанонаў і г. д.).

У курсах тэрмадынамікі статычнай фізікі, якія вывучаюцца ўсімі студэнтамі фізічнага факультэта, незалежна ад спецыялізацыі, разглядаецца не сам фізічны працэс, а толькі канчатковы вынік любой незваротнай з'явы — у становішчы раўнавагі. Але, відавочна, яшчэ больш важна ведаць не толькі стан раўнаваговай сістэмы, але і ўсю паслядоўнасць станаў, якую яна праходзіць, гэта значыць, кінеціку працэсу. Напрыклад, у раўнавазе тэмпература ўздоўж сістэмы з'яўляецца велічыной пастаяннай, але апісанне працэса выраўнівання тэмператур з'яўляецца задачай цеплаправоднасці.

Вернемся да гэтага ж пытання з пункту гледжання прыкладнай навукі і сучаснай тэхнікі.

Напрыклад, праблема выкарыстання атамнай энергіі ў мірных мэтах зводзіцца (калі не лічыць розных праблем тэорыі аўтаматыкі і рэгуліравання і тэхнічных пытанняў) да даследвання працэса пераноса нейтронаў, цеплаабменаў у ядзерных энергетычных установах і гідрадынамікі розных цепланасіцеляў у іх.

Асваенне космаса таксама, за выключэннем пытанняў тыпу агавораных вышэй, прыводзіць да розных праблем гідрадынамікі сціскаемых вадкасцей, цеплаабмена і рашэння розных задач хімічнай кінетыкі.

Вывучэнне незваротных працэсаў прадстаўляе цікаўнасць у шырокім дыяпазоне, пачынаючы з астрафізічных праблем (старая праблема так званай «цеплавой смерці Сусвету», а дакладней, энтрапіі Сусвету ў цэлым; квазары — незвычайныя астранамічныя аб'екты, мажліва зменяць нашы погляды на некаторыя тэрмадынамічныя законы) і канчаючы біяфізічнымі — тэрмадынамічнае апісанне жыцця, баланс энтрапіі ў адкрытых сістэмах, якімі з'яўляюцца жывыя арганізмы.

Некалькі слоў аб арганізацыі вучэбнага працэсу. Прафіліруючыя курсы, якія чытаюцца для студэнтаў нашай спецыялізацыі адпавядаюць пералічаным вышэй праблемам, у крайнім выпадку, нейкай часткі іх, найбольш важных для развіцця навукі. Гэта гідрадынаміка вязкай вадкасці, рэчываабмен і самаабмен, газадынаміка вязкай вадкасці, рэчываабмен і масаабмен, газадынаміка і фізіка ўдарных хваль, тэорыя гарэння і высокатэмпературныя гідрадынамічныя з'явы; фізіка плазмы, цеплавая ахова лятаючых апаратаў, тэхніка фізічнага эксперыменту і цеплавых вымярэнняў, агульная тэорыя незваротных працэсаў.

Вучэбны працэс арганізаваны з улікам вопыту Новасібірскага універсітэта і некаторых маскоўскіх вну, дзе кафедры непасрэдна звязаны з адпаведнымі акадэмічнымі і іншымі навуковымі ўстановамі. Лекцыі на кафедры цеплафізікі чытаюцца супрацоўнікам інстытута цепла-і масаабмена АН БССР, якія непасрэдна вядуць работу ў данай галіне. Значная частка лабараторных работ выконваецца студэнтамі ў ІЦМА, у тым ліку на ўнікальных навуковых установках, якія маюцца ў інстытуце.

Адначасова развіваецца лабараторная база кафедры ва універсітэце. Удзел студэнтаў старэйшых курсаў у навуковых даследаваннях, што праводзяцца ІЦМА, не толькі пажаданы, але і неабходны, як для саміх студэнтаў так і для інстытута.

На кафедрах фізічнага факультэта зараз шмат вельмі цікавых у навуковых адносінах і важных для прыкладання спецыялізацый. Таму толькі адзначым, што наша навука маладая і не толькі не завершана, але, наадварот, знаходзіцца на пачатку свайго развіцця. Стварэнне тэорыі на многа нераўназначных працэсаў — задача бліжэйшай будучыні. Апошняе дзесяцігоддзе характарызуецца значнымі поспехамі. Але галоўнае яшчэ наперадзе, яно чакае нас.

Загадчык кафедры цеплафізікі прафесар А. В. ЛЫКАЎ, Т. Л. ПЕРЭЛЬМАН.

*(Газета «За навуку»).*




# КУЛЬТУРА ЦІ ФАРМАЛЬНАСЦЬ?

**У 9-м нумары нашай газеты я пазнаёмілася з артыкулам выкладчыцы кафедры савецкай журналістыкі дацэнта Е. Бондаравай «Што значыць быць культурным?» Мяне таксама хвалюе гэтая тэма.**

**Я згодна з думкамі дацэнта, пачаўшай гэтую дыскусію, што кожны культурны чалавек з густам апранаецца, заўсёды ветлівы ў паводзінах, уважлівы да сяброў і гэтак далей. І, на мой погляд, нашы студэнты, менавіта, такія і ёсць. Цяпер ужо цяжка знайсці такога хлопца-студэнта, пра якога б можна было сказаць, што ён не ўмее апранацца, не ведае, якога колеру касцюм больш за ўсё яму падыходзіць. Тое ж самае можна сказаць і ў адносінах да дзяўчат. Каб упэўніцца ў гэтым, варта прыйсці хоць на адзін універсітэцкі вечар. Амаль у кожным убранні — свая ўласная ідэя. Яна, звычайна, залежыць ад характару, мод і імкнення чалавека.**

**Паводзіны чалавека.. Памойму, тут таксама моладзь не заслугоўвае асаблівых папрокаў. Нельга паскардзіцца і на няўважлівасць мужчынскага полу. Хлопцы цяпер пайшлі даволі галантныя. Прапусцяць цябе і дадуць зайсці і выйсці першай, і паліто дапамогуць апрануць, і аловак хуценька падымуць з падлогі, і сумку паднясуць, і месца ў аўтобусе прапануюць, сто разоў будуць разшаркивацца за самую маленькую дробязь. Вітаючыся, могуць нават крыху галаўны ўбор прыўзняць. І ўсё гэта ў іх атрымліваецца прыгожа, нават**

**Ну, хто скажа, што цяперашні студэнт наш не такі? Вядома, такі! Значыць, усё? Поўная культура?!**

**Уласна, я супраць таго, каб вызначаць узровень культуры на тым, як умела і тонка падбірае сабе чалавек вопратку, як ён міла ўсміхаецца, як хуценька кідаецца за ўпаўшым на падлогу алоўкам... Бо ўсё гэта: і адзенне, і элементарныя правілы паводзін — толькі форма, знешняе выражэнне культуры, усяго толькі сухі манекен, з грудзей якога не даносіцца стук сэрца. І такіх «манекенаў» сярод нас, студэнтаў, на жаль, яшчэ вельмі многа.**

**Набыць знешні лоск не так ужо і складана. Але значна цяжэй дабіцца высокай унутранай культуры, пасябраваць з ёй настолькі, каб яна стала роднай, як маці. Мне ўспамінаецца адзін выпадак. Неяк зайшоў да нас у пакой былы выпускнік філалагічнага факультэта. Апрануты, як кажуць, з іголачкі. З разумным выразам твару. Як быццам, уважлівы, тактычны. На кожным кроку: «Прабачце, калі ласка», «дзякую», «дазволю сабе», «будзьце добрыя, тольні не крыйдуйце». На першы погляд усё, як і павінна належаць. Але ў хуткім часе нашы дзяўчаты толькі паспявалі чырванець. Не, не за сябе, не за сваю нязграбнасць, а за фанабэрыстасць хвалько-госця, які лічыў, што знаходзіцца ў асяроддзі выключна першакурснікаў і карыстаўся момантам, каб паказаць, які ён культурны і разумны ў параўнанні з гатымі «прышчальцамі з**

**му было аб'яўлена, што прысутныя даўным-даўно ведаюць яго і як былога студэнта, і як чалавека (а вучыўся ён не так ужо і добра, і прыкладнымі паводзінамі не славіўся), ён адразу абмяк. І дзе падзелася крыўлянне! Перад намі звычайны чалавек, які толькі хвіліну назад некуды далей схаваў сваё «я», і, ведаеце, адразу папрыгажэў.**

**Такія выпадкі сустракаюцца часта. Узнікае пытанне, дык ці можна лічыць ужо адразу чалавека па-сапраўднаму культурным, калі ён з густам апранаецца і ўмее разшаркавацца ў абыходжанні? Вядома, не.**

**Быць культурным — гэта, у першую чаргу, быць сціплым у адносінах да сваёй асобы, не займацца самапапулярызацыяй. Сапраўдны культурны чалавек ніколі не будзе давіць сваім аўтарытэтам ці ведамі ні на блізкіх, ні на сяброў нават у тым выпадку, калі ён цвёрда ўпэўнены, што многімі сваімі якасцямі пераўзыходзіць прысутных. У гэтых адносінах вечным прыкладам для нас будзе першы камісар асветы Анатоль Васільевіч Луначарскі. У Наркоме асветы не было чалавека з такімі глыбокімі і энцыклапедычнымі ведамі, як у Луначарскага. Але Анатоль Васільевіч ніколі не злоўжываў гэтымі абставінамі. Да яго было зусім проста падыйсці і спытаць пра што хочаш. Ён ніколі не кідаў у адрас субяседніка насмешліва — пагардлівых позіркаў, маўляў, як можна не ведаць такога. Як добра было б, каб нашы студэнты перанялі для сябе менавіта гэтую рысу характару наркома. Бо многім з нас прыдзецца пасля заканчэння вучобы паехаць у вёску! Вядома: там мы будзем сустракацца з менш адукаванымі людзьмі. Але малады, па-сапраўднаму культурны чалавек пастараецца, каб людзі не заўважалі розніцу ў адукацыі. Каб яны ніколі не адчувалі сябе ні на кроплю абражанымі.**

**Карацей кажучы, мне здаецца, што знешняе выражэнне культуры, яе форму мы, студэнты, усвоілі даволі няблага, а вось унутраная — іменна яна і ёсць сапраўдная культура — недзе яшчэ ў дарозе. Дык выйдзем жа насустрач і працягнем ёй свае рукі на вечнае сяброўства.**

**Р. ЛУКАШЭВІЧ,**
студэнтка філалагіч-



Пасля паспяховай здачы экзамена група студэнтаў геолага-геаграфічнага факультэта адпачывае на беразе Свіслачы.

Фота А. Кадзета.

# ГОСЦЬ З ІНДЫІ — НАШ ВЫКЛАДЧЫК

**Плённа працуе ў галіне навуковых даследаванняў па мовазнаўству дацэнт Мікалай Андрэевіч Паўленка. Ён аўтар некалькіх манаграфій і прац, якія з'яўляюцца каштоўнымі дапаможнікамі для студэнтаў філалагічных факультэтаў універсітэтаў і інстытутаў.**

**Нядаўна вучоны вярнуўся з Індыі, дзе займаецца навуковымі даследаваннямі па мовазнаўству. Шмат цікавага, новага пазнаў Мікалай Андрэевіч за час прабывання ў далёкай краіне, знайшоў многа добрых сяброў. Сваімі ўражаннямі ён падзяліўся на сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі 30 мая.**

А. РОМЧЫК.

● СПОРТ ● СПОРТ ● СПОРТ ● СПОРТ ● СПОРТ ● СПОРТ ● СПОРТ ●

# КУБАК ВЯРТАЕЦЦА ДА ГАСПАДАРОЎ

Асаблівае значэнне па масавасці ва універсітэце ў апошнія гады набывае стралковы спорт. Аматараў яго ў БДУ шмат, характэрна, што ў ім актыўны ўдзел прымае прафесарска-выкладчыцкі калектыў, а таксама лабаранты. Тым спартсменам, у якіх пільнае вока, моцная вытрымка, заўсёды вязе. Так здарылася ў спаборніцтвах вышэйшых навучальных устаноў сталіцы рэспублікі па стральбе, якія былі прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады і 900-годдзю Мінска. Выдатных поспехаў дабілася ў іх жаночая каманда універсітэта. У трох практыкаваннях з чатырох нашы дзяўчаты занялі першае месца і ў адным — другое. Выдатна выступіў дуэт, у саставе, якога былі старшы бугалтар мясцкома Л. І. Левіна і асістэнтка кафедры фізікі цвёрдага цела С. І. Жукава. Яны былі першымі ў стральбе з малакалібернай вінтоўкі (МВ-9, МВ-5).

Студэнткі Л. Жукоўская і Л. Станкевіч у практыкаваннях з малакалібернага пісталета МП-3 занялі першае месца, а з пісталета МП-5 — другое.

Затое ў мужчын «спартыўнага шчасця» не было. Яны выступілі не так удала, як жанчыны, і прайгралі амаль у роўнай барацьбе такім камандам майстроў, як МРТІ, МДМІ.

Няўдача ў паядынках са спартсменамі Радыётэхнічнага, Беларускага політэхнічнага і Мінскага медыцынскага інстытутаў не выклікала разгубленасці ў камандзе БДУ. У яе паявілася нейкае незвычайнае стараннe, прага, чаго б гэта не каштавала, дабіцца перамогі на раённых спаборніцтвах. Галоўным прэтэндэнтам тут на першае месца былі спартсмены Медыцынскага інстытута. Дарэчы, першае месца і кубак, заваяваныя імі пяць год назад у БДУ належалі МДМІ.

Раённыя спаборніцтвы маглі канчаткова вырашыць, каму дастанецца першае месца і пераходны кубак. Пяцігадовая традыцыя на гэты раз была парушана. Стралкі нашага універсітэта не ўступілі камандзе Медыцынскага інстытута і занялі першае месца. Пасля пяцігадовага перапынку кубак зноў вярнуўся ў наш універсітэт.

Ю. СКАЗІН.



Вышыню ў 175 см. пераадольвае Чарапкоў (фізфак). Фота А. Астапава.

# ЛІДЭРА ВЫЗНАЧАЕ АДЗІН ГОЛ

Восенню мінулага года ў Магілёве былі праведзены спаборніцтвы вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі па футболу. У іх удзельнічала і каманда нашага універсітэта, якая заняла трэцяе месца.

І вось некалькі дзён назад адбыўся занальны турнір па футболу ў праграме Усебеларускай студэнцкай спартакіяды. У маляўнічы горад Горкі з'ехаліся зборныя каманды ІФК, нашага універсітэта, Інстытута народнай гаспадаркі, Гомельскага педагагічнага інстытута, Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Балельшчыкі змаглі атрымаць сапраўдную асалоду, задавальненне ад гарачых паядынкаў, імкненне атрымаць перамогу ў цікавай і змястоўнай гульні. На гэты раз спартыўнае шчасце зноў выпала на долю ІФК. Яны, як і восенню, занялі першае месца ў турнірнай табліцы. Футбалісты Інстытута фізкультуры набралі максімальную колькасць ачкоў. Яны выйгралі ўсе чатыры матчы. Асабліва вызначыўся ў іх футбаліст пад нумарам адзін — варатар. Ён прапусціў у свае вароты толькі адзін гол. Такім чынам ІФК з выдатнай розніцай мячоў 10:1 стаў лідэрам спаборніцтваў.

Выдатна падрыхтаваліся да гэтых паядынкаў футбалісты нашага універсітэта. Іх сустрэчы збіралі заўсёды многа балельшчыкаў; характэрна, што большасць з іх у сваіх «прагнозах» лічыла, што, менавіта, каманда універсітэта зойме першае месца. Падставы для такіх меркаванняў былі даволі абгрунтаваныя. Наша каманда без паражэнняў правяла ўсе сустрэчы, прычым у іх паказала ўменне майстэрскі апрацоўваць мяч і рабіць даволі небяспечныя прарывы ў штрафную пляцоўку. Таму паядынка зборнай нашага універсітэта і ІФК чакалі ўсе. Барацьба была напружанай і вострай. Пасля свістка аб пачатку гульні, нашы юнакі адразу ж кінуліся наперад, нападаючыя робяць «прастрэлы» варот, здавалася, што вось-вось будзе гол. Але паступова атакі футбалістаў нашага універсітэта пачалі затухаць. Гульня выраўнялася. У ёй нельга было даць перавагу ні той ні другой камандзе. І толькі адзін гол, забіты ў вароты юнакоў БДУ, падвёў вынік гэтаму цікаваму і багатаму па зместу паядынку.

Ітак, нашы футбалісты з адным пройгрышам занялі другое месца. Гэта нядрэнны вынік «сярэбраных» прызёраў першынства.

І. САМСОНАЎ.



На фінішы ўдзельнікі спартыўнай хадзьбы.

# ГАРАЧЫ ПАЯДЫНАК

*Закончылася спартакіяда вышэйшых навучальных устаноў сталіцы па шахматах, прысвечаная 50-годдзю Савецкай улады і 900-годдзю Мінска.*

*Асноўная барацьба за званне мацнейшых каманд вну ішла паміж студэнтамі нашага універсітэта і Беларускага політэхнічнага інстытута. І гэта не выпадкова: калектывы каманд узначальваюць майстры спорту А. Капенгут (БПІ), і В. Купрэйчык (БДУ), у складзе каманд мацнейшыя ў рэспубліцы кандыдаты ў майстры.*

*Але ж спаборніцтвы без паражэнняў не ўдалося правесці ні той ні другой камандзе. Студэнты політэхнічнага прайгралі шахматыстам тэхналагічнага інстытута, а каманда універсітэта «спатыкнулася» ў сустрэчы з аўтсайдэрам спаборніцтваў — студэнтамі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. У рашаючых паядынках паміж лідэрамі перамога дасталася політэхнікам. Напомнім, што шахматысты гэтага інстытута занялі чацвёртае месца ва ўсесаюзным спаборніцтве вышэйшых навучальных устаноў краіны, якое праводзілася ў 1966 годзе ў Мінску.*

*На другім месцы аказаўся калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, на трэцім — студэнты тэхналагічнага інстытута.*

*Г. МЯДЗЮХА,*
*галоўны сакратар спаборніцтваў.*

# КАРАЛЕВА СПОРТУ І «ДАМОКЛАЎ МЕЧ»

Два дні на стадыёне «Дынама» праходзіла міжфакультэцкае першынство нашага універсітэта па лёгкай атлетыцы. Прысутнічаючы на стадыёне, можна было назіраць бязрадасную вялікую спартыўную барацьбу, бо ўсе віды «каралевы спорту» праходзілі без сапраўднай бадзёрасці і імкнення дабіцца як мага лепшых вынікаў. На стадыёне адчуваліся таксама абыякавыя адносіны некаторых спартсменаў і раўнадушша аргкамітэтаў да вынікаў паядынкаў.

У чым справа? Чаму паявіліся такія адносіны ў студэнтаў да лёгкай атлетыкі? Прычыну, мне так здаецца, тут адшукаць нескладана. Давайце паглядзім на расклад правядзення першынства. Тэрмін спаборніцтва якраз супаў з пачаткам летняй экзаменацыйнай сесіі, «байцы - цаліннікі» нават здалі ўжо многія экзамены. Таму ўдзельнічаць у спаборніцтве — гэта значыць загубіць вельмі каштоўны акадэмічны час, карацей над студэнтамі павіс «дамоклаў меч» сесіі. Мне здаецца, што залікі і экзамены з'явіліся прычынай нізкай масавасці. Каб падцвердзіць свае вынікі прывяду некалькі характэрных прыкладаў.

На старт фінальнага забега на 100 метраў у мужчын былі выкліканы шэсць спартсменаў. Гучыць выстрал старцёра і на дыстанцыі сапернічаюць... двое. А дзе ж астатнія чатыры ўдзельнікі фінала? Самым хуткім студэнтам універсітэта аказаўся пасля фінала на 100 метраў Якубоўскі (гістфак). Яго вынік 11,5 сек. аказаўся на 0,1 сек. лепшым выніка другога прызёра, таварыша па камандзе Папкоўскага...

А вось яшчэ два прыклады, якія падцвярджаюць той факт, што дзяўчат-спартсменак, відаць, ва універсітэце няма. У сектары па скачках у вышыню знаходзілася ўсяго толькі пяць спартсменак. Перамогу атрымала Альха (хімфак). Яе вынік на 20(!) сантыметраў лепшы, чым у заняўшых адпаведнае другое і трэцяе месца Бацюк і Анкут.

А па скачках у даўжыню прыняло ўдзел толькі тры спартсмены. Ці не перакананыя гэта прыклады раўнадушных адносін да лёгкай атлетыкі ва універсітэце?!

Не лепшае па масавасці і спартыўных дасягненнях становішча і ў мужчын. У трайным счаку перамогу атрымаў Бароўскі (хімфак), яго дасягненне — 14 метраў 58 сантыметраў. Яго супернік па камандзе Бураў заняў з вынікам 13 метраў 87 сантыметраў другое места. Усяго 1 сантыметр прайграў яму Маставы (фізфак).

У скачках у высату на першую ступеньку першынства падняўся студэнт хімічнага факультэта Кулінковіч. Яго вынік — 180 см. аказаўся не пад сілу Чарапкову (фізфак), які быў другім.

Месцы спаборніцтва ў агульнакамандным заліку размеркаваліся наступным чынам: гістфак, хімфак, фізфак, юрфак, філфак, матфак, геолага - геаграфічны, біялагічны.

*Фота і тэкст А. Астапава.*

# ДУШАНБІНЦЫ Ў ЗАХАПЛЕННІ

У гэтыя дні наш універсітэт наведала дэлегацыя з сонечнага горада Душанбэ. На прыёме прысутнічалі сакратар Ленінскага райкома КПБ М. А. Дубавец, прарэктар універсітэта доктар фізіка-матэматычных навук А. В. Валадзько, намеснік сакратара парткома У. С. Багданаў, старшыня мясцкома І. Т. Рагоўскі, сакратар камітэта камсамола М. Д. Ціва. У часе трохгадзіннай шчырай і сардэчнай гутаркі была выказана думка аб устанаўленні цесных навуковых сувязей, аб абмене студэнцкімі дэлегацыямі, вырашаны многія іншыя важныя пытанні.

Пасля госці азнаёміліся з навукова-тэхнічнай базай нашага універсітэта, з умовамі побыту і вучобы студэнтаў. У захапленні засталася дэлегацыя з Душанбэ ад выдатнага галоўнага корпуса, яго лабараторый, якія аснашчаны навейшым абсталяваннем, вялікую ўвагу звярнулі яны таксама на багаты археалагічны музей і нумізматычны кабінет гістарычнага факультэта.

А. СЕРДЗЮКОВІЧ.

# СМАЛЯВІЦКІЯ СУСТРЭЧЫ

«Дружба!», «Братэрства!», «Роўнасць!»

Гэтыя словы на розных мовах народаў гучалі днямі ў адным з інтэрнатаў Смалявіч на вечары інтэрнацыянальнай дружбы, куды завітала група замежных студэнтаў нашага універсітэта, якія навучаюцца на падрыхтоўчым факультэце.

Цёпла сустрэты прысутнымі, выступіў в'етнамец Ву Нгок Ан. Ён расказаў аб вялікай радасці за шчаслівае жыццё савецкіх дзяцей.

— Веру, што такое будучае чакае і маладшае пакаленне В'етнама, бо мы будуем сацыялізм. Але па шляху да гэтага ў нас многа цяжкасцей. Пакуль нашым дзецям у вашым узросце прыходзіцца капаць акопы, траншэі. І сярод нашых юнакоў таксама ёсць Мараты Казеі...

Гэтыя словы патанулі ў гарачых апладысментах, поўных шчырасці, дружбы і салідарнсаці з в'етнамскім народам. Прамова Ву Нгок Ана была прасякнута вялікай падзякай працоўным Савецкага Саюза за дапамогу гераічнаму в'етнамскаму народу.

Афрыканец Марсель Кулунамі расказаў прысутным аб жыцці, вучобе і выхаванні дзяцей на афрыканскім кантыненце

У заключэнні вечара быў дадзены вялікі сумесны канцэрт. Замежныя сябры расказвалі вершы на розных мовах. Група в'етнамскіх студэнтаў выканала «Марш вызвалення Паўднёвага В'етнама», на рускай мове — «Песню аб трывожнай маладосці», «Расцвітай, Сібір» і іншыя.

У час развітання зала доўга скандыравала на розных мовах — «Дружба».

І. ШВЕДАЎ.

РЭПЛІКА

# НЕ ЗАБЫВАЙЦЕ ПРА НАС

У НАРОДЗЕ бытуе думка, быццам журналісты сябе ніколі не пакрыўдзяць. На гэты раз атрымалася наадварот. «Пакрыўдзілі» не аднаго-двух чалавек, а ўвесь факультэт. І дзе б вы думалі? У чытальнай зале нашага універсітэта.

Вось прыкладна якая размова адбылася тут.

— Мне б якую-небудзь літаратуру па кіно ці тэлебачанню?

— Такой няма.

— Тады можа што па мастацтву?

Але і па гэтаму жанру літаратуры не аказалася ў нашай бібліятэцы. Нягледзячы на тое, што аддзяленне журналістыкі ў нашым універсітэце існуе не першы год і што нам, мабыць, як нікому, патрэбны кнігі па мастацтву, такога аддзелу ў нашай «чыталцы» не існуе.

Недаравальна і тое, што аддзел «Бальшавіцкі друк» не ўкамплектаваны літаратурай па кіно, радыё, тэлежурналістыцы.

Заканчваючы нашу размову, мы звяртаемся да работнікаў чытальнай залы з просьбай: «Не забывайце пра нас, калі ласка. Не чужыя ж мы вам».

А. ЯРОХІН.

Дэканат, партбюро і ўвесь калектыў гістарычнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры гісторыі БССР прафесару Лаўрэнцію Сямёнавічу Абэцэдарскаму з выпадку напаткаўшага яго гора—смерці маці.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.